**Шмат А.В.,** студэнт 114Т гр.

Навуковы кіраўнік – Гулак А.А.

# СЕМАНТЫКА БЕЛАРУСКІХ ПРОЗВІШЧАЎ (НА ПРЫКЛАДЗЕ СТУДЭНЦКАЙ ГРУПЫ)

Галіна мовазнаўства *анамастыка* (ад грэч. Onomastike – майстэрства даваць імёны) вывучае функцыянальныя і моўныяасаблівасці ўласных імёнаў.У анамастыцы шмат напрамкаў,адзін з іх – *антрапаніміка*– вывучае імёны людзей, прозвішчы, імёны па бацьку, мянушкі.

За апошнія гады ў нашай навуцы з‘явілася шмат арыгінальных прац, прысвечаных даследаванню спецыфікі ўласных імёнаў. Галоўнымі даследчыкамі анамастыкі, чый багаты навуковы матэрыял абагульнены ў тэарэтычных працах, з‘яўляюцца М. Бірыла, В. Лемцюгова, В.Шур, Б. Сачанка, Г. Мезенка. У сваім даследаванні мы абапіраліся пераважна на выданні «Беларуская мова. Энцыклапедыя» (1994), М.Бірыла «Тыпалогія і геаграфія славянскіх прозвішчаў» (1988), «Беларуская анамастыка: зборнік артыкулаў» (1992) і іншыя.

Спецыфіка прадмета *анамастыкі* ў тым, што яго вывучэнне выходзіць за межы мовазнаўства і патрабуе ўліку гістарычных, геаграфічных, сацыяльна-эканамічных і іншых фактараў. У пацверджанне дадзім словы Я. Станкевіча, які, даследуючы дахрысціянскія беларускія імёны, пісаў: «Усе тагачасныя (дахрысціянскія) імёны нашы можна падзяліць на дзве вялікія групы. Адну – складалі назвы звяроў (*Дзік, Ліс, Мядзведзь, Воўк* і інш.), птушак (*Бусел, Зязюля, Ластаўка, Лебедзь, Пятух, Сокал, Варабей* і інш.), статка (*Бык, Казёл, Вол* і інш.), раслін (*Хмель, Дуб, Ігруша, Клён, Краска, Кветка, Ляшчына, Ружа* і інш.), рэчаў (*Скрыня, Дзежка, Таўкач* і інш.)»[3, с.29-30].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У беларускай, як і ў іншай мове, колькасць анамастычных назваў не падаецца ўліку. Толькі каля трыццаці тысяч афіцыйных назваў населеных пунктаў[2, с.7-8], апрача гэтага шмат неафіцыйных, напрыклад, разнастайных мянушак. На прыкладзе прозвішчаў студэнтаў 114т группы мы зрабілі ўласнае антрапанімічнае даследаванне.

Прозвішчаў, утвораных ад *апелятываў* (спецыяльны тэрмін: імя агульнае ў супрацьлегласць імю ўласнаму) у беларускай анамастыцы даволі многа. Яркім прыкладам гэтага з'яўляецца прозвішча *Казлова*. Падлічана, што яны складаюць каля 40% ад усіх вядомых [3, с. 12-33].Дарэчы тут адзначыць,што беларускія прозвішчы тыпу *Грыб,Воўк,Казёл,Баран,Зязюля, Шпак, Ясень* і іншыя аказалі ўплыў на прадуктыўнасць парышэння гэтай мадэлі ў рускім асяроддзі, пра што сведчаць сучасныя рускія прозвішчы[3, с.29]. Другая гіпотэза: прозвішча тыпу *Казлова* можа паходзіць ад мянушкі.Частка мянушак характарызуе паводзіны ці знешні выгляд, індывідуальныя асаблівасці чалавека (*Воўк, Баран, Мядзведзь*).Так, мянушку *Воўк* чалавек мог атрымаць за нелюдзімы характар, *Казёл*– за ўпарты нораў і інш.

Прозвішча тыпу *Кавалік* узнікла ад слова ***каваль*** (рамеснік, які займаецца коўкай металу). Падлічана, што самым пашыраным у свеце з'яўляецца прозвішча генетычна звязанае менавіта з дзеясловам *каваць*: Кавалевіч, Каваль, Кавалік, Кавалёў (бел.), Коваль (укр.), Кузнецов (руск.), Kowal, Kowalski (польск), Schmied (нямецк), Smith (англ.) і інш.

Прозвішчы, утвораныя ад назвы рамяства/прафесіі ці сацыяльнага статусу, даволі часта сустракаюцца ў нас: *Смаляр (Смоляр), Цясляр, Бондар, Бандарэнка, Ганчар, Бабраўнічы, Падлоўчы, Харунжы, Драгун, Капітан, Гайдаш, Рымар, Мытнік, Дзягцяр, Цівун, Віж*і інш. Частка такіх прозвішчаў часцей сустракаецца сярод беларускіх яўрэяў: *Кучар, Лекар,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Слесар, Муляр, Цырульнік, Балагол, Кушнір, Рамізнік, Магазіншчык, Крамар*і інш.

Карані польскіх імёнаў і прозвішчаў на тэррыторыі Беларусіідуць з XV-XVII ст., калі людзі атрымлівалі найменні ад назваў маёнткаў, земляў. У XIX-XX ст. адбывалася міграцыя палякаў у Беларусь і адпаведна павелічэнне іх прозвішчаў: *Дымбоўскі, Русецкі, Голік, Клімчык, Мруз*, *Ястрэмскі.* Прозвішча *Ястрэмскі* з‘яўляецца якраз беларусіфікаваным польскім прозвішчам *Ястржэмбскі,*якое ўзыходзіць да апелятыва *ястраб* [3, с. 29-36]. Таксама іншамоўнага паходжання прозвішча *Сманцар*.

Цікавую групу ўяўляюць прозвішчы тыпу *Любезны*. Цалкам верагодна, што гэта мянушка з‘яўлялася сведчаннем унутрысямейных адносін: бацькі маглі называць доўгачаканае дзіця. Вельмі многа прозвішчаў, якія выражаюць характарыстыку чалавека (*Хітры, Ждан, Някрас, Целяпень, Гняўко*).

Асобныя мадэлі беларускіх прозвішчаў таксама выяўляюць акрэсленыя арэалы іх бытавання: прозвішчы на *–оў (-аў,еў),-ін, -ын* уласцівы пераважна паўночнаму ўсходу Беларусі (Віцебская, Магілеўская, усходнія раёны Гомельскай абласцей) [1, с. 49]. Напрыклад, прозвішчы беларускіх пісьменнікаў, дзеячаў культуры, навукі (Быкаў, Лынькоў, Сіпакоў і інш.).Прозвішча *Прэжын*, па меркаванні даследчыкаў, пайшло ад кораня *-прэж* і суфікса *-ын.*

Трэба таксама адзначыць, што на самым раннім этапе прозвішчамі былі двухслоўныя найменні, у структуру якіх уваходзіла ўласнае імя і патранімічная форма з суфіксамі *-овіч,-евіч, -іч,-іц,-еня,-аня,-ін,-оў, -еў* і інш. Гэта значыць імены па бацьку тыпу Лукашэвіч (Лукашэня, Лукашоў). Асновай прозвішча *Лукашэвіч* паслужыла хрысцільнае мужчынскае імя *Лука* (у перакладзе з старажытна грэчаскай мовы азначае «святло»). Такім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чынам, нашчадак чалавека па імені *Лука/Лукаша*, з часам атрымаў прозвішча *Лукашэвіч* [3, с.37-40].

Прозвішчы на *-скі,-цкі*ў асноўным маюць тапанімічны характар, г.зн. утвораны шляхам пераходу прыметнікаў у назоўнікі. Напрыклад: *Тураўскі, Ашмянскі, Полацкі* і інш. Асновы з такімі суфіксамі маглі ўказваць на мясцовасць, уладанне, якое належала асобе, або на мясцовасць, адкуль гэта асоба паходзіць. У пазнейшы час пад уплывам польскай мовы найменні на -*скі, -цкі* пачалі ўтварацца ад уласных імёнаў тыпу *Васілеўскі, Пятроўскі, Іваноўскі.*

У выніку можна сказаць, што мадэлі ўтварэння прозвішчаў, адзначаныя ў даследуемай групе, сведчаць пра тое, што частка з іх паходзіць ад апелятываў і ад мужчынскага імя продка. Частка сфарміравалася як характарыстыка асабістых якасцей чалавека. Ёсць прозвішча, утворанае ад роду заняткаў. Група прозвішчаў мае замежнае паходжанне.

---

1. Бірыла, М.В. Беларуская антрапанімія: у 3 ч. Ч. 1. Уласныя імёны, імёны-мянушкі, імёны па бацьку, прозвішчы. / М.В. Бірыла.– Мінск : Навука і тэхніка, 1966. – 328 с.; Ч. 2. Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1969. – 505 с.; Ч. 3. Структура ўласных мужчынскіх імён. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982.– 428 с.

2. Шур, В. Беларускія ўласныя імёны: Беларуская антрапаніміка і тапаніміка / В.В. Шур. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1998. – 198 с.

3. Шур, В.В. З гісторыі ўласных імёнаў / В.В. Шур. – Мінск : Вышэйшая школа, 1993. – 154 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ